# Д.І. ПАГУЛЯЕЎ: ДА 120-ГАДАВІНЫ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Выдатны геолаг, географ і педагог Данііла Іванавіч Пагуляеў нарадзіўся ў 1895 г. у в. Горы Горацкага раёна. Пасля атрымання сярэдняй адукацыі, браў удзел у Першай сусветнай вайне. Д. Пагуляеў скончыў Рагачоўскае педвучылішча (1919), Смаленскі педінстытут (1924), з якім звязаў усё астатняе жыццё.

У даваенны час Данііла Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю, працаваў выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры геалогіі Смаленскага педінстытута. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Кавалер трох ордэнаў Айчыннай вайны І-ІІ ступеняў, Чырвонай Зоркі, шэрага медалёў.

З 1946 г. і да выхаду на пенсію (1971) узначальваў спачатку кафедру фізгеаграфіі і геалогіі, потым – геалогіі і картазнаўства. Доктар геолага-мінералагічных навук (1957), прафесар (1958) Пагуляеў не быў кабінетным вучоным – яго цягнулі экспедыцыі, гео-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лагаразведачныя работы, цікавілі пытанні практычнага прымянення сваіх ведаў. Ён займаўся галоўным чынам вывучэннем Смаленскай, Бранскай абласцей і тэрыторый, што да іх прылягаюць, у т.л. роднай Магілёўшчыны.

Адкрытыя і апісаныя экспедыцыямі Д.І. Пагуляева радовішчы шкляных пяскоў, вапнякоў, фасфарытаў Смаленскай, Бранскай і Калужскай абласцей распрацоўваюцца да сённяшняга дня.

Па выніках палявых даследаванняў Д.І. Пагуляевым напісана больш за 100 навуковых прац, у т.л. больш за 50 – манаграфічнага зместу. Працы Данііла Іванавіча не згубілі сваёй актуальнасці і ў XXI ст.

Навукова-педагагічнай дзейнасць Данііла Іванавіча Пагуляева адзначана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага сцяга, званнем «Заслужаны дзеяч навукі РСФСР». Імем нашага земляка названа адна з навучальных аўдыторый Смаленскага педуніверсітэта.

***У.Г. Хамякоў***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова